Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
_______________Ю.П.Бондар
―___"_____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД-__/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ ПОМНІКАЎ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Мінск 2012

**Праграму распрацавала**

***А.М.Нароўская***, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, дацэнт, кандыдат гістарычных навук.

**Рэцэнзенты**

***М.М. Елінская***, кандыдыт гістарычных навук, галоўны спецыяліст аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі РБ;

***А.А. Гулак,*** кандыдат філалагічных навук, старэйшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклора

Рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства (пратакол № 1 ад 30 жніўня г.)

прэзідыумам навукова-метадычнага савета УА ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў (пратакол № ад г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Праграма курса ―Музеефікацыя помнікаў матэрыяльнай культуры" прызначана для студэнтаў па спецыяльнасці ―музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны".

Авалоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова падрыхтаванага спецыяліста ў галіне музейнай справы. У працэсе вывучэння курса студэнты набываюць веды па пытанням, звязаным з комплексным працэсам музеефікацыі помнікаў, які ўключае даследаванне, рэстаўрацыю, захаванне ці аднаўленне аб'екта, інтэрпрэтацыю і арганізацыю агляду помніка шляхам распрацоўкі маршруту.

*У выніку засваення вывучэння курса "Музеефікацыя помнікаў матэрыяльнай культуры" студэнты павінны ведаць:*

– асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя праблемы музеефікацыі і сутнасць асноўных паняццяў;

– шляхі і спосабы музеефикацыі архітэктурных помнікаў як аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны;

– тэндэнцыі развіцця музеефікацыі і асноўныя яе этапы

*Студэнты павінны умець:*

– ужываць ідэі і катэгорыі музеефікацыі;

– аналізаваць працэсы музефікацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іншых краінах свету;

– ахарактарызаваць новыя тэндэнцыі працэса музеефікацыі помнікаў

– ацэньваць перспектывы музеефікацыі;

– ужываць на практыцы разнастайныя метады музеефікацыі.

Курс ―Музеефікацыя помнікаў матэрыяльнай культуры" непасрэдна звязаны з выкладаннем тэорыі і гісторыі музейнай справы, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, гісторыі Беларусі, археалогіі, архітэктуры і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У межах вывучэння курса прадугледжаны наступныя віды заняткаў: лекцыі, семінары, азнаямленне з архітэктурнымі аб’ектамі, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Атрыманыя веды замацоўваюцца ў працэсе практыкі ў музеях краіны.
Формы кантроля ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА**

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лек. | семінар. заняткі | сам. раб. |
| Уводзіны | | | | |
| **Раздзел I. Музеефікацыя як кірунак музейнай дзейнасці** | | | | |
| ***Тэма 1.*** Музеефікацыя як сродак захавання гісторыка-культурнай спадчыны | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 2.*** Музеефікацыя помнікаў драўлянага дойлідства | 4 | 2 | 2 | |
| ***Тэма 3.*** Праблемы музеефікацыя помнікаў археалогіі | 4 | 2 | 2 | |
| ***Тэма 4***. Музеефікацыя крэпасцей і замкаў | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 5.*** Музеефікацыя паркаў Беларусі | 4 | 2 | 2 | |
| ***Тэма 6.*** Музеефікацыя помнікаў прамысловай архітэктуры | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 7.*** Музеефікацыя помнікаў беларускага іканапісу | 4 | 2 | **2** | |
| ***Тэма 8.*** Музеефікацыя гістарычных цэнтраў | 2 | 2 | | |
| Усяго ... | 24 | 16 | 8 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раздзел I. Музеефікацыя як кірунак музейнай дзейнасці**

### *Тэма 1. Музеефікацыя як сродак захавання гісторыка-культурнай спадчыны*

Асноўныя паняцці і сутнасць музеефікацыі. Інтэрпрытацыя паняцця ў працах Ф. І. Шмідта, Э. А. Шулепавай, Т. Ю. Юрэневай і іншых.

Гісторыя і этапы музеефікацыі помнікаў матэрыяльнай культуры ў Заходняй Еўропе, ЗША, СССР, Беларусі. Віды музеефікацыі. Формы і метады музеефікацыі. Актуалізацыя і музеефікацыя нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Музеефікацыя як спосаб захавання і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны. Асаблівасці і праблемы музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў канцы XX-пачатку XXI стст.

### *Тэма 2. Музеефікацыя помнікаў драўлянага дойлідства*

Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (1976). Навуковая канцэпцыя музеефікацыі помнікаў драўлянага дойлідства

Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам. Актуальнасць выяўлення помнікаў драўлянага дойлідства. Унікальныя помнікі драўлянага дойлідства.

Аптымальныя формы захавання і прыстасавання помнікаў народнага дойлідства да сучасных умоў. Формы і метады захавання помнікаў драўлянай архітэктуры. Фрагментарная рэканструкцыя. Праблемы захавання помнікаў драўлянага дойлідства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Праблемы музеефікацыя помнікаў археалогіі*

Актуальныя праблемы захавання і выкарыстання помнікаў археалогіі. Ахова старажытных цэнтраў і культурнага слою. Праблемы захавання і музеефікацыі археалагічных аб’ектаў на тэрыторыі вялікіх і малых гарадоў. Сістэматычныя ахоўныя раскопкі на новай метадычнай аснове.

Рэжым існавання археалагічных музеяў-запаведнікаў пад адкрытым небам. Археалагічныя і гэадэзічныя даследаванні. Вылучэнне музея-запаведніка са сферы гарадской забудовы. Праблема замацавання аўтэнтычных археалагічных рэшткаў з розных будаўнічых матэрыялаў. Комплекс ахоўных водаадводных мерапрыемстваў. Метады музейна-кансервацыйнай дзейнасці на помніках археалогіі: метад ―каўпака”, метад натурнай кансервацыі, метад рэканструкцыйна-археалагічнага макеціравання.

Вядзенне на тэрыторыі запаведніка сістэматычных археалагічных раскопак на новай метадычнай аснове. Вызначэнне зон аховы.

Экспазіцыя старажытнай гісторыі Друцкай воласці ў Талочынскім краязнаўчым музеі і макетная рэканструкцыя ўмацаванняў Друцка XII-XIIIстст. Стварэнні археалагічных музеяў-запаведнікаў. Музеефікацыі археалагічнага аб’екта на гарадзішчы ―Бярэсце” (1977-1981). Канцэпцыя музеефікацыі Мінскага гарадзішча (2009) і яе перспектывы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Музеефікацыя крэпасцей і замкаў*

Праблемы музеефікацыі крэпасцей і замкаў. Вывучэнне метадаў, тэхналогіі і матэрыялаў гістарычных будаўнічых рамёсел. Вопыт рэстаўрацыі перыяда ―бетанізацыі” (1970-1990). Найноўшыя тэхналогіі кансервацыі крэпасцяў і замкаў.

Канцэпцыя і рэалізацыя кансервацыі і рэстаўрацыі замка-крэпасці. Захаванне аўтэнтычнасці, інфарматыўнай каштоўнасці і эстэтычных якасцяў тарсальнай архітэктуры. Кансервацыя замка-крэпасці: захаванне

ацалелых арыгінальных сцен, вежаў, байніц і іншых частак крэпасці. Экспанаванне руін.

Музеефікацыя Мірскага і Лідскага замкаў. Музеефікацыя мемарыяльный —Брэсцкая крэпасць-герой”. Музеефікацыя Бабруйскай крэпасці.

### *Тэма 5. Музеефікацыя паркаў Беларусі*

Актуальнасць праблемы захавання паркаў і асноўных элементаў гістарычнага паркавага ландшафту. Класіфікацыя паркаў па ступені іх захаванасці і па стылёвых асаблівасцях. Мерапрыемствы па захаванні паркавых кампазіцый і збудаванняў.

Музеефікацыя гістарычнага парка. Выяўленне відаў і структуры паркаў. Этапы даследавання па вывучэнню тэрыторыі паркаў: геадэзічны, гістарычны, дэндралагічны, археалагічны. Збор дакументацыі аб парку і парках з аналагічнымі характарыстыкамі. Вывучэнне эвалюцыі парка.
Меры па захаванню цэласнасці паркаў і асноўных элементаў гістарычна-паркавага ландшафту. Этапы працы пры аднаўленні. Рэстаўрацыя і рэстытуцыя гістарычнага парка. Рэгенерацыя як метад аднаўлення. Рэстытуцыя паркаў. Вызначэнне межаў сядзіб і паркаў. Аднаўленне пабудоў сядзіб.

Малыя архітэктурныя формы гістарычнага парка і іх аднаўленне. Вызначэнне зоны аховываемага прыроднага ландшафта. Музеефікацыя паркаў у Нясвіжы, Міры. Музеефікацыя Лошыцкага парка. Аднаўленне палацава-паркавага комплексу ў сядзібе Агінскага ў Залессі.

Музей валуноў як помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Умоўныя зоны музея валуноў.

Пастанова Міжнароднага Камітэта ІКОМАС аб ахове і гістарычных паркаў. Вызначэнне гістарычнага парку. Ахова юрыдычная і адміністратыўная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6. Музеефікацыя помнікаў прамысловай архітэктуры*

Ступень вывучанасці праблемы ў галіне рэнавацыі і рэканструкцыі гістарычных збудаванняў. Пытанні класіфікацыі і тыпалогіі тэхнічных музеяў. Сістэма адбора помнікаў прамысловай архітэктуры для разяшчэння музея. Канцэпцыя захавання прамысловай архітэктуры уральскіх даследчыкаў.

Замежны вопыт музеефікацыі гістарычных прамысловых будынкаў. Канцепцыя музея прамысловасці г. Мінска ў гістарычным індустрыяльным ландшафце. Праблема функцыянавання тэхнічных музеяў. Ахоўнае і музейнае заніраванне даследуемай тэрыторыі.

Праблема музеефікацыі прамысловых аб’ектаў у Беларусі. Будынкі Мінскага лікера-гарэлачнага завода –Крышталь”. Музеефікацыя будынкаў завода –Аліварыя”. Музей гісторыі завода –Аліварыя”. Музей піва. Музеефікацыя прамысловага аб’екта – шклозавода –Нёман”.

Спецыфіка экспазіцыйнай дзейнасці навукова-тэхнчных музеяў. Фарміраванне музейных экспазіцый, сістэматызацыя экспанатаў, класіфікацыя помнікаў гісторыі тэхнікі на базе комплекса помнікаў прамысловай архітэктуры.

Міжнародныя арганізацыі, якія займаюцца праблемамі вывучэння і захавання індустрыяльнай спадчыны. Міжнародны камітэт па захаванню індустрыяльнай спадчыны (TICCI), арганізацыя –Еўракультура”, Архітэктурны універсітэт урбаністыкі Венецыя і інш.

### *Тэма 7. Музеефікацыя помнікаў беларускага іканапісу*

Абразы як шматкампанентная структура. Метады даследавання. Вывучэнне тэхналогіі стварэння абразоў. Выяўленне першаснага размяшчэння абраза. Біялагічныя і механічныя пашкоджванні. Дэфектныя акты. Карантін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Этапы музеефікацыі помнікаў беларускага іанапісу. Рэстаўрацыя абразоў. Выпраўленне механічных пашкоджванняў. Прафілактычная заклейка. Тэхналогія ўмацавання ляўкасу і фарбавага слоя. Асноўныя спосабы замацавання ляўкасу. Выдаленне запісаў, пацямнеўшай аліфы. Аднаўленне абразоў. Метад ―урэзкі‖. Аптымальны рэжым захавання абразоў у музеях. Экспанаванне іканапісу ў беларускіх і замежных музеях.

### *Тэма 8. Музеефікацыя гістарычных цэнтраў*

Малыя гарады, як захавальнікі гістарычнай і культурнай спадчыны. Мястэчкі Беларусі, спецыфічныя асаблівасці іх планіроўкі. Захаванне прынцыпаў развіцця, непаўторнасці прыроднага ландшафта і рэгіянальнай спецыфікі малых гарадоў. Аднаўленне і ахова каштоўных і значымых будынкаў малых гарадоў. Праблемы ўдасканалення архітэктурнага і прасторавага асяроддзя невялікіх гарадскіх пасяленняў. Архітэктурны савет краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (АССЕЕ) (1994). ―Устойлівыя каштоўнасці архітэктуры малых гарадоў‖ на Кангрэсе Міжнароднага саюза архітэктараў у г. Стамбуле.

Канцэпцыя музеефікацыі гістарычных цэнтраў гарадоў (Мінск, Полацк, Гродна, Магілёў і іншыя)  і яе перспектывы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *.Беззубова, О. В.* Некоторые аспекты теоретического осмысления музея как феномена культуры // Триумф музея? / СПбГУ, Гос. Эрмитаж; отв. ред. А. А. Никонова. — СПб.: Осипов, 2005. — С. 6 -27.

2. *. Добровольская, Э. Д.* Музеефикация памятников архитектуры: Теория и практика, искусство экспозиции, новые сценарии и концепции (1980-е годы) // Музейное дело и охрана памятников: Обзор информации / НИО «Информ-культура». — Вып. I. — М., 1989. — 47 с.

3. *. Дукельский, В. Ю.* Музей и культурно-историческая среда // Музееведение: проблемы культурной коммуникации в музейной деятельности: Сб. науч. тр. НИИ культуры — М.: НИИК, 1989. —С. 107-116.

4. *Калнін, В.В.* Мірскі замак / В.В.Калнін. – Мн.: Беларусь, 2002. – С. 49–54, 70, 71.

5. *. Карпов, С. В.* Памятник архитектуры как объект музеефикации // Актуальные проблемы советского музееведения: Сб. науч. тр. — М., 1987. — С. 40-49.

6. *Каулен, М.Е.* Музеефикация объектов наследия: от предмета до традиции // Культура рос. провинции: век XX — XXI веку: Тез. докл. Всерос. науч.-практ. конф. 2000 г., Калуга, 23-26 мая 2000 г. Калуга: Эйдос, 2000. - С.199-209.

7. *Лакотка, А.І.* Беларусы: у 8 т. Т.2: Дойлідства / А.І.Лакотка. – Мн.: Тэхналогія, 1997. – С.234–292.8

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Локотко, А.И.* Белорусское народное зодчество: середина XIX–XX в. / А.И.Локотко. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – С.261–269.

9. *Никитина, Н.А.* Музеефикационная импирика: рецепции и переработки. [Электронный ресурс]. Кафедра музейного дела и охраны памятников философского факультета СПбГУ. Режим доступа: http://museum. philoso-phy.pu.ru/ Nikitina. – 20.03.2011.

10. *Соустин, А. С.* К вопросу о приспособлении памятников архитектуры под музей // Вопросы охраны, реставрации и пропаганды памятников истории и культуры: Сб. науч. трУНИИ культуры.—М.,1982. — С. 8-18.

11. *Сундиева, А. А.* Музей как культурная форма // Культурные миры: Мат-лы науч. конф. «Типология и типы культур: разнообразие подходов» / М-во культуры РФ. Рос. ин-т; отв. ред. В.А. Гуркин — М., 2001. — С.210- 216.

12. *Технология,* исследование и хранение произведений станковой и настенной живописи. – М.: Изобразительное искусство, 1987. – С.75–117; С. 323–341.

13. *Шляхтина, Л. М,* Мастеница Е. Н. Становление и развитие музееведческой мысли в трудах Ф. И. Шмита // Собор лиц . — С. 32 - 40.

14. . *Шулепова, Э.А.* Музеефикация памятников как механизм использования культурного наследия в регионе: автореф. дис. На соиск. учен. степ. д. культуролог, н. : Спец. 24.00.02 : Спец. 24.00.03 / Моск. пед. гос. ун-т. М, 1998.-42 с.

15. *Шулепова, Э. А.* Музеефикация памятников архитектуры // Российская музейная энциклопедия: В 2 т. — М., 2001,—Т. I. — С. 390.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*


1. *.Багласаў, С.Г.* Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыіі/ С.Г.Багласаў//Помнікі старажытнай беларускай культуры. – Мн.,1984. – С.126-132.
2. *Будыко, Н.С.* Садово-парковое наследие в Белоруссии (дооктябрьский период)/ Н.С.Будыко. – М..1985. – 17 с.
3. *Копытин, В.* Проблемы охраны памятников археологии в Чернобыльской зоне Могилевщины / В.Копытин // Каштоўнасці мінуўшчыны-4. – Мн., 2001. -- С.45--46.
4. *Локотко А.И.*Архитектурное наследие Беларуси. Развитие традиций, охрана и реставрация / А.И.Локотко. – Мн.:Право и экономика, 2004. – 303 с.
5. *Международная* хартия по консервации и реставрации памятников и достопримечательных мест (Венеция, 1964)// Каштоўнасці мінуўшчыны-2.- Мн., 1999. – С.126-129.
6. *Международная* хартия по охране исторических городов (Вашингтон, 1987)//Каштоўнасці мінуўшчыны-2. – Мн.,1999.—С.149—152.
7. *Подъяпольский, С.С.* Реставрация памятников архитектуры: учеб.пособие для вузов / С.С.Подъяпольский, Г.Б.Бессонов, Л.А.Беляев, Т.М.Постников. – М.:Стройиздат, 1988. – С.23-30; 137-155.
8. *Помнікі* этнаграфіі. Методыка выяўлення, апісання і збірання. – Мн., 1981. – С. 95—110; 116—120.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МУЗЕЕФІКАЦЫЯ ПОМНІКАЎ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова*
*гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Рэдактар

Тэхнічны рэдактар

Падпісана ў друк Фармат 60х84 1/16

Папера пісчая №2. Ум. друк. арк.

Ул.-выд. арк. Тыраж экз. Заказ

Ліцэнзія 02330/ 0131818 ад 2 чэрвеня 2006 г.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17

Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе

Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

220007, г.Мінск, вул.Рабкораўская, 17

Ліцэнзія ЛП № 496 ад 25. 06. 2002 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ